ОРГАН парткома прафкома і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

27 ВЕРАСНЯ 1937 г. № 14 (44)

НА НІЗКІМ УЗРОЎНІ КРЫТЫКІ

На справаздачна-выбарчым сходзе ЛКСМБ

24 верасня пачаўся справаздачна-выбарчы комсамольскі сход БДУ. Сход праходзіць пасля гістарычных рашэнняў IV пленума ЦК ВЛКСМ, праходзіць тады, калі па усёй краіне вядзецца вялікая работа па ачышчэнню комсамольскіх арганізацый ад заклятых ворагаў народа і іх прыхвасняў.

Зараз па БССР заканчваецца справаздачна-выбарчая кампанія. Гэта абавязвала камітэт комсамола ўлічыць усе памылкі і недахопы, дапушчаныя радам арганізацый, гэта абавязвала як след падрыхтаваць сход, каб правесці яго на высокім палітычным узроўні.

Аднак, усяго гэтага камітэт комсамола не ўлічыў. Справаздачны даклад тав. Гурыновіча не быў дастаткова палітычна завостраны. Тав. Гурыновіч перапяваў вядомыя арганізацыі факты, да рэчы, не даваў ім належнай палітычнай ацэнкі. Між тым, становішча ў комсамольскай арганізацыі абавязвала камітэт зрабіць зусім іншую справаздачу.

Камітэт комсамола нават і пасля выкрыцця ворагаў народа ва універсытэце не зрабіў належных вывадаў, не мабілізаваў арганізацыю на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. Да гэтага часу ў арганізацыі застаюцца людзі, не ўнушаючыя ніякага палітычнага давер'я.

Вось, напрыклад, тав. Фабрыкант, які яшчэ да гэтага часу з'яўляецца чамусьці комсоргам курса. Фабрыкант разваліў работу курсавой комсамольскай арганізацыі, адарваўся ад комсамольскіх мас. Справа дайшла да абураючага становішча, што асобныя комсамольцы не ведаюць свайго комсорга.

Сам Фабрыкант таямнічымі шляхамі прабраўся ў СССР. У камітэце ведалі аб усім гэтым, але бясклопатнасць дайшла да таго, што справу аб ім не разбіралі і пакідалі яго ў кіраўніцтве комсамольскай арганізацыі курса.

Не глядзячы на зусім ясныя ўказанні таварыша Сталіна на лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) аб неабходнасці ўзмацніць большэвіцкую пільнасць, чаго патрабуе ад нас факт капіталістычнага акружэння, але комсамольскі камітэт не зрабіў і з гэтага неабходных вывадаў. Было многа размоў аб пільнасці і капіталістычным акружэнні, але сапраўднай большэвіцкай пільнасці ў камітэце комсамола не было.

Не можа задаволіць нас і становішча палітвучобы. Палітзаняткі праходзілі на нізкім палітычным узроўні. Асабліва ў школах прапагандыстаў Акімавай, Андрушчанкі і інш. Мала скарыстоўваліся на занятках першакрыніны. Кансультацыі і семінары не задавальнялі прапагандыстаў. Комсамольцамі-прапагандыстамі прафсаюзнага камітэта не кіраваў. Няўважлівы падбор прапагандыстаў прыводзіў да таго, што ў рады кіраўнікоў палітшкол пападала трацкісцкая свора (Верам'юк) і палітычна нявытрыманыя людзі (Хаціпскі і інш.).

У комсамольскай арганізацыі, як і наогул ва ўніверсітэце культавалася адна з форм зажыму крытыкі — перэагаванне на сігналы друку і выступленне комсамольцаў на сходах. Гэта прывяло і да нізкай актыўнасці на справаздачна-выбарчым сходзе.

Комсамольскі камітэт і адказны за абаронную работу тав. Кучар сваёй бяздзейнасцю садзейнічалі развалу ваенна-фізкультурнай работы. Ваенна-тэхнічныя экзамены ў БДУ зусім сарваны. Таксама нічога не робіцца па падрыхтоўцы вараншылаўскіх стралкоў, планерыстаў, парашутыстаў, пілотаў, значкістаў ППХА, ГПА і ГСА.

Было не мала сур'ёзных сігналаў аб бяздзейнасці Кучара і загадчыка ваеннай кафедры Спегальскага. Але камітэт далей размоў не ішоў. Гэтыя людзі і зараз «кіруюць» абароннай работай ва універсітэце.

Можна было чакаць, што даклад аб бяздзейнасці комсамольскага камітэта выкліча рэзкую крытыку з боку выступаючых у спрэчках комсамольцаў. Але на сходзе гэтага не атрымалася. Выступаючыя пашлі па шляху дакладчыка і зноў гаварылі аб тых-жа даўно вядомых фактах.

Новаму камітэту комсамола трэба будзе сур'ёзна ўлічыць становішча арганізацыі і ўрокі справаздачна-выбарчага схода ў сваёй практычнай рабоце.

ПОСПЕХІ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

Услед за універсітэцкай спартакіядай, якая паказала значныя поспехі, 24 верасня на стадыёне «Дынамо», нашы фізкультурнікі прымалі ўдзел у закрыцці лёгка-атлетычнага сезона. Універсітэт выставіў 4 каманды.

У малай шведскай эстафеце першай выступіла жаночая каманда ў складзе Шчэмелевай, Дзяшко, Бараноўскай, Севасцьянавай. Яны занялі 4 месца. Затым мужчынская каманда — Зязюля, Брыш, Апельбаум и Скорабагаты выйшлі пераможцамі ў вялікай швецкай эстафеце, заняўшы першае месца сярод вытворчых калектываў.

Жаночая каманда ў складзе Сцюль)а віч, Гольберг, Ерменка, Залатарэнка і Барысевіч у эстафеце 5 х 500 занялі першае месца. Яны атрымалі прыз закрыцця лёгка-атлетычнага сезона.

Апошнімі выступалі мужчыны (Крышчановіч, Тумас, Зіневіч, Лісаковіч і Малец) у эстафеце 5 х 1000, якія абагналі каманду педінстытута, але першае месца асталося за камандай «Спартак».

БРЫШ.

Пад агонь самакрытыкі работу профбюро

Не адзін раз студэнты крытыкавалі дрэнную работу профбюро хімфака, але справа не палепшылася. Соцспаборніцтва на факультэце, носіць фармальны характар. Асабліва дрэнна пастаўлена культурна-масавая работа. Культработнік тав. Карасіна абмяжоўваецца толькі раздачай білетаў у кіно або ў тэатр.

Студэнты некалькі разоў патрабавалі ад профбюро і тав. Кукінай, каб арганізаваць навуковы дыспут, вечар самадзейнасці і т. д., але нічога гэтага за ўвесь справаздачны перыяд не было зроблена. Работай дабраахвотных грамадскіх арганізацый ніхто не кіруе і яны фактычна развалліся.

Неўзабаве пачнуцца перавыбары профбюро. Члены саюза павінны ўзяць пад агонь самакрытыкі работу профбюро і абраць у новы склад профбюро здольных і аддатых справе таварышоў.

В-АЯ.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НАВУКОВЫМІ КАДРАМІ ГЕАФАК

Геаграфічны факультэт БДУ існуе ўжо чацверты год. У пачатку сваёй арганізацыі ён насіў гучную назву: геолага-глебазнаўча-геаграфічны факультэт. У 1937 г. па невядомай прычыне два аддзяленні (геалагічнае і глебазнаўчае) былі ліквідаваны.

Пры рэарганізацыі факультэта студэнтам абяцалі вельмі многа, але на справе атрымоўваецца адваротнае. У гэтым годзе на факультэце няма ні аднаго навуковага работніка са званнем прафесара. Увесь выкладчыцкі склад састаіць з асістэнтаў і кандыдатаў у дацэнты.

Дэкан геафака тав. Андрушчанка нічога не робіць, каб забяспечыць факультэт адпаведнымі навукозымі кадрамі. І як вынік—важнейшая дысцыпліна гістарычная геалогія змазваецца, бо яе чытае зусім непадрыхтаваны выкладчык тав. Кавалёў. Сам. тав. Андрушчанка, не будучы спецыялістам па фізгеаграфіі капіталістычных краін, узяўся чытаць гэты адказнейшы курс. Рад другіх дысцыплін таксама чытаецца выключна дрэнна, а эканамічная геаграфія зусім не пачыналася чытацца. Акрамя гэтага бываюць частыя зрывы занятак.

Рэктарыят БДУ павінен прыняць тэрміновыя захады, каб забяспечыць геафак навуковымі кадрамі.

СТУДЭНТЫ.

ЗА РАБОТУ ПА-НОВАМУ

Профсаюзная арганізацыя БДУ праводзіць зараз перавыбары сваіх органаў. Перавыбары праходзяць ва ўмовах вялікага павароту ў палітычным жыцці нашай краіны, ва ўмовах узнятай палітычнай актыўнасці мас на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

Вораг народа заўсёды імкнуліся падарваць магутнасць нашай радзімы. Таварыш Сталін не раз папярэджваў партыю і рабочы клас аб павышэнні большэвіцкай пільнасці і аб канчатковым выкарчоўванні трацкісцка-бухарынскай своры, шпіёнаў і дыверсантаў.

Апошні пленум ВЦСПС у сваёй пастанове адзначыў, што профсаюзныя органы адарваліся ад профсаюзных мас, культурны ўзровень і палітычная актыўнасць якіх вельмі вырасла. Гэта поўнасцю адносіцца і да нашага прафкома і факультэцкіх профработнікаў. Большэвіцкая крытыка, якая была разгорнута на справаздачнаму дакладу старшыні прафкома тав. Камінскага, ускрыла дрэнныя метады работы прафкома.

Бюракратызм, адрыў ад студэнцкіх мас, парушэнне прынцыпаў профсаюзнай дэмакратыі і прытупленне класавай пільнасці, не давалі магчымасці прафкому праводзіць па-большэвіцку барацьбу з класавымі ворагамі, пранікшымі ва ўніверсітэт.

«Некаторыя профработнікі лічаць, што барацьба са шкоднікамі, ворагамі рабочага класа — гэта не іх справа, а справа іншых органаў. Яны забылі аб тым, што партыя неаднаразова патрабавала ад профсаюзаў барацьбы з бюракратычнымі скажэннямі у совецкіх і гаспадарчых органах, а тым больш—барацьбы са шкоднікамі ў справе культурна-бытавога абслугоўвання» (IV пленум ВЦСПС).

Адной з велізарных задач соцыялістычнага будаўніцтва з'яўляецца барацьба з перажыткам капіталізма у эканоміцы і свядомасці мас.

Ці змагаўся наш прафком за выкананне гэтай задачы партыі? Не, нельга гэтага сказаць. Палітычна-выхаваўчая, масавая работа ў профарганізацыі настаўлена дрэнна. Наліагітацыя была сарвана ў мінулым годзе, не наладжана яна і зараз. Асабліва гэта злачынна цяпер, калі наша краіна рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР па Сталінскай Канстытуцыі і агітацыя набывае асаблівае значэнне.

Мастацкая самадзейнасць студэнтаў не заахвочвалася, не работалі харавы, драматычны і іншыя гурткі.

Прафком не кіраваў навукова-даследчымі гуркамі, якія лічыліся толькі на паперы.

Асабліва недапушчальна-бюракратычныя адносіны прафкома былі да соцспаборніцтва і ўдарніцтва. У выдатнікі часта вызначаліся студэнты, якія ў сапраўднасці не былі выдатнікамі.

У справе палітыка-выхаваўчай масавай работы сярод студэнтаў прафком і камітэт комсамола павінны былі працаваць у самым цесным кантакце. Але гэтага ў іх не было. Бюракратызм і зазнайства работнікаў прафкома і камітэта комсамола (у першую чаргу Камінскага, Гурыновіча і Рыбакова) перашкаджалі па-большэвіцку працаваць у адной упражцы па выхаванню студэнцкай моладзі універсітэта.

Разгарнуўшы большэвіцкую крытыку і самакрытыку, агульны сход прызнаў работу прафкома нездавальняючай. Гэта павінен улічыць новавыбарчы склад прафкома і паставіць работу профарганізацыі БДУ на узровень палітычных задач краіны, пастаўленых партыяй і таварышам Сталіным.

АУЛАДАЦЬ БОЛЬШЭВІЗМАМ!

УЗОРНА ПАСТАВІЦЬ ПАРТВУЧОБУ

Наша партыя і таварыш Сталін надаюць велізарнае значэнне ідэалагічнаму росту комуністаў. Пленум ЦК ВКП(б) у усёй рашучасці паставіў пытанне аб павышэнні палітычнага выхавання і аўладання большэвізмам. Ворагі народа усямерна імкнуліся зрызаць палітычнае выхаванне комуністаў і працоўных мас. Яны даводзілі вывучэнне гісторыі партыі толькі дакастрычніцкага перыяда. Гэта свора не хацела, каб масы выхоўваліся і закаляліся на бавых старонках гісторыі ленінска-сталінскай партыі, на тым перыядзе партыі, калі быў разгромлен контрреволюцыйны трацкізм і бухарынскія рэстаўратары капіталізма.

Аднак не ўсе комуністы нашай арганізацыі ўсвядомілі важнасць палітычнага выхавання. Вось, на першыя заняткі гуртка па вывучэнню твораў класікаў марксізма (прапагандыст тав. Чымбург) з'явілася толькі 6 чалавек з агульнага ліку 16. У гуртку па вывучэнню гісторыі партыі (прапагандыст тав. Камінскі) з 17 чалавек на занятках прысутнічала ўсяго 9. Неабходна асоба ўказаць на тое, што комуністы Прановіч, Комлік, Магіленка, Суворай, Еўсюкевіч, Міхалевіч, Тупіца праігусцілі першыя і другія заняткі.

Некаторыя комуністы (Рогаў, Каленік і др.) прыходзяць на партыйныя заняткі не падрыхтаванымі. Яны нічога не чытаюць з рэкамендацыйнай літаратуры.

Партыйны камітэт павінен зрабіць з гэтага належны вынік. Трэба прыцягнуць да адказнасці комуністаў, якія нядбайна адносяцца да партыйных заняткаў. У гэтым годзе партвучобу мы павінны паставіць узорна.

МІЛЬМАН.

Больш увагі замежным мовам

ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКУ

Наша партыя і ўрад надаюць выключнае значэнне вывучэнню замежных моў. Пытанне ставіцца так, каб студэнты, канчаючы ВНУ, уладалі нямецкай, французскай, або англійскай мовамі. І ў гэты час дэканат гістфака, не мабілізуе студэнтаў IV курса на вывучэнне моў, а наадварот дэзарганізуе іх.

Так, па распараджэнню дэкана тав. Чымбурга, студэнты IV курса павінны вывучаць па выбару у абавязковым парадку нямецкую ці французскую, або дрэўне-рускую мовы. У выніку каля адной трэці курса запісалася на вывучанне дрэўне-рускай мовы, куды пашлі здольныя студэнты, як Мельнічонак, Перапецкі, Бондараў, Чысцік і іншыя з мэтай ухіліцца ад вывучэння адной з заходне-еўрапейскай моў.

Мы лічым, што гэта няправільная ўстаноўка. Гэта не значыць, што гісторыку не патрэбна вывучаць дрэўне-рускую мову, наадварот, яе патрэбна ведаць, але гэту мову можна было-б вывучаць факультатыўна, тады як нямецкую і французскую мовы па выбару патрэбна вывучаць кожнаму студэнту. Дэканат павінен неадкладна выправіць гэту памылку.

К месцу будзе тут указаць і на тое, што французская мова выкладаецца вельмі дрэнна. Педагагічны працэс на занятках французскай мовы (выкладчыца т. Шэрамець-еўская) праходзіць без усякай сістэмы, без сістэматычнага, паслядоўнага паўтарэння пройдзенага матэрыялу, праходзіць так, што студэнты ніколі не аўладаюць мовай. Матэрыял праходзіцца вынадкова, без плана. Кожная лекцыя не мае пэўнай мэтавай устаноўкі. Граматычны матэрыял будуецца не на спецыяльна падобраных для гэтага сказах, а на спех складзеных у часе лекцыі.

Усімі гэтымі фактамі дэканат гістфака павінен тэрмінова заняцца і прыняць належныя захады.

С. Н.

ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ НА ЗАВОЧНЫ СЕКТАР

На завочным сектары БДУ цяпер навучаецца 720 чалавек, а з новым прыёмам будзе налічвацца каля 1000 студэнтаў. Гэтая лічба гаворыць за тое, якая вялікая цяга да вышэйшай асветы сярод настаўнікаў БССР і якое вялікае значэнне ў сістэме Наркомасветы мае завочны сектар БДУ.

Ворагі народа з Наркомасветы імкнуліся ўсімі мерамі і сродкамі разваліць і сарваць завочнае навучанне шляхам падбору неадпавядаючых работнікаў, яўна шкодніцкімі дырэктывамі і шляхам ігнаравання завочнага навучання. У былога кіраўніцтва БДУ (Ермоленка) завочны сектар быў таксама на задворках. На яго не звярталася ніякай увагі, ён ігнараваўся.

Усё гэта прывяло да развалу завочнага навучання пры БДУ. З 720 завочнікаў у гэтым годзе пераводзіцца з курса на курс усяго толькі 71 чал. Акрамя гэтага трэба ўказаць, што за гэты навучальны год адсеялася 247 чалавек. Назвучальныя планы і праграмы ніколі не разглядаліся на кафедрах, а да іх, як вядома, прыклалі добра свае брудныя лапы ворагі народа. У выніку чаго своечасова не былі іх'яты шкодніцкія праграмы па педагогіцы, генетыцы, эволюцыйнаму вучэнню і др.

Трэба прама сказаць, што нашы кафедры стаялі і цяпер стаяць у баку ад завочнага навучання. Іх зусім не цікавіць хто і як вядзе той ці іншы курс. У выніку гэтага адказнейшыя універсітэцкія курсы вядуць часта непадыходзячыя па сваёй падрыхтаванасці выкладчыкі і гэтым самым вышэйшая завочная асвета пры БДУ зводзіцца да асветы за сяроднюю школу. Вось прыклады: фізіку у мінулым навучальным годзе вёў асістэнт Шыдлоўскі і гэта важнейшая дысцыпліна правалена: з 120 чалавек, слухаўшых курс, здалі толькі 3. На прыродазнаўчым факультэце курс зоалогіі безназванковых вяла асістэнт Чэрамісава і вынік атрымаўся не лепшы чым па фізіцы. Да вядзення практычных занятак дапускаліся нават студэнты.

Работа кансультацый пастаўлена вельма дрэнна. Учот паспяховасці не наладжан і дрэнна работае канцэлярыя. У грашовых справах былы нам. рэктара БДУ па завочнаму навучанню Серко дапусціў яўнае шкодніцтва. Так, напрыклад, выкладчык Мацісава атрымоўвала пенсію за 60 гадзін, а павінна была атрымаць за 21 гадзіну. Такі малюнак назіраецца амаль за ўсімі выкладчыкамі завочнага сектара.

У выніку такой шкодніцкай дзейнасці Серко, на кастрычнік, лістапад і снежань месяцы не хопіць асігнаваных грошай на зарплату выкладчыкам. Пра гэту шкодніцкую махінацыю Серко добра ведалі метадыст, кандыдат партыі, студэнт хімфака тав. Суворай і загадчык кансультацыйнага пункта, кандыдат партыі, студэнт фізмата Юшпэ, але ніякіх мер не прадпрынялі.

Трэба адзначыць, што работнікі завочнага сектара Суворай і Юшпэ, наогул глядзяць на работу ў завочным сектары, як на «халтурку», дзе можна атрымоўваць грошы нічога не робячы.

Зараз ідзе прыём завочнікаў і падрыхтоўка да новага навучальнага года, а загадчык менскага кансультацыйнага пункта Юшпэ і метадыст Суворай нічога ў гэтым напрамку не робяць.

Партыйнаму камітэту, рэктарыяту БДУ, МК БДУ і ўсёй грамадскасці універсітэта трэба звярнуць належную ўвагу на завочны сектар і паставіць завочнае навучанне універсітэта так, як гэтага патрабуе партыя і ўрад.

Я. Т.

„САМАСТОЙНА ДАВУЧЫЦЕ"

Дзейнасць ворагаў на фізмаце прывяла к таму, што ў навучальным 1936-37 годзе пераведзена з курса на курс толькі 114 чалавек з агульнага ліку 230 студэнтаў. На яўрэйскай секцыі пераведзена на наступны курс усяго-на-ўсяго...адзін студэнт.

З усяго гэтага дэканат фізмата не зрабіў належных вывадаў. За гэта гаворыць хоць-бы такі факт, як складанне праграм да дзяржаўных экзаменаў. Па указанню Камітэта па справах вышэйшай школы праграмы да дзяржаўных іспытаў складаюцца па фактычна пройдзенаму матэрыялу, а на фізмаце гэта робіцца зусім інакш.

У праграму па фізіцы ўнесена палова матэрыялу зусім незнаёмага студэнтам, бо яны ніколі яго не праходзілі. І, калі студэнты сталі гэтаму пярэчыць, то прафесар Снятков (ён складаў гэту праграму) адказаў: «Самастойна давучыце».

Такая самая справа і з праграмамі па тэарэтычнай механіцы. Горш таго, гідрамеханіка зусім не чыталася, а ў дзяржаўныя экзамены ўнесена.

Вельмі характэрна, што дэкан фізмата тав. Гельфанд стаіць у баку ад гэтай важнейшай справы.

Студэнт V курса Ф. Х.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

„НЕЧАГА ЛАМАЦЬ МАТАЦЫКЛ"

У снежні 1936 года універсітэт набыў для вучэбнай мэты матацыкл. У той час ставілася пытанне аб арганізацыі гуртка матацыклістаў. Студэнты былі вельмі задаволены гэтым мерапрыемствам, часта даведваліся, калі пачне работу гурток.

Час ішоў, а гурток матацыклістаў усё яшчэ не быў арганізаван і, нарэшце, стала ясна, што яго ніколі не будзе у БДУ. Загадчык ваеннай кафедры тав. Спегальскі заявіў: «Нечага ламаць матацыкл для гэтай мэты».

Няпер для нас зразумела, чаму так заявіў тав. Спегальскі, бо ён дзяржаўны матацыкл зрабіў сваёй уласнасцю. Усю вясну і цэлае лета тав. Спегальскі катаўся на ім у горадзе і па прыгарадных дарогах, пры гэтым купляў таручае за універсітэцкія сродкі.

На сёння матацыкл выбыў ужо са строю і знаходзіцца ў рамонце. Вельмі характэрна, што рэктарыят БДУ ніколі не цікавіўся становішчам гэтай каштоўнай машыны і не сказаў своечасова тав. Спегальскаму: «Нечага ламаць матацыкл».

Ст-т.

„РОТМАН АПУСЦІЎ РУКІ"

Інтэрнацыянальныя качуцці брацкай салідарнасці растуць з кожным днём. І ў гэты час мопраўская арганізацыя БДУ канчаткова развалілася. Старшыня бюро МОПР'а тав. Ротман астаўся адзін, і той зараз апусціў рукі і нічога не робіць. Мопраўскія ўзносы на факультэтах не збіраюцца, новыя члены не прымаюцца і не вядзецца падрыхтоўка да абмену білетаў.

На кожным факультэце стаяць запыленыя, абарванымі мопраўскія дошкі. Каля іх часта праходзіць, няжка уздыхаючы, тав. Ротман, але мер не прымае, каб яны прынялі належны выгляд.

Трэба тав. Ротману «падняць рукі» і наладзіць работу мопраўскай арганізацыі БДУ.

ЮДЗІН.

ВЫБАРЧЫ ЗАКОН—У МАСЫ

Задача агітатара і прапагандыста заключаецца не толькі у тым каб правесці чытку «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» і добра растлумачыць артыкул за артыкулам, растлумачыць усю тэхніку падрыхтоўкі і правядзення выбараў. Не абмяжоўваючыся гэтым, агітатар, а таксама і прапагандыст павінны растлумачыць **палітычнае значэнне і цэннасць кожнага артыкула палажэння,** яго крыніцыповую сутнасць і адказаць на ўсе ўзнікаючыя у масах пытанні.

Праведзеныя заняткі у комсамольскіх і прафсаюзных палітшколах па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» паказалі, што сярод слухачоў палітшкол узнікае цэлы рад незразумелых пытанняў, на якія часта прапагандысты няправільна адказваюць. Ідучы насустрач запатрабаванням студэнтаў, редакцыя «За ленінскія кадры» адказвае на ўзнікшыя пытанні:

ПЫТАННЕ 1. Ці можа выбаршчык, часова выбыўшы у другую акругу, галасаваць за кандыдата той акругі, у якой стала пражывае?

АДКАЗ. Не, не можа. Наш выбарчы закон патрабуе, каб кожны выбаршчык асабіста, у парадку, устаноўленым артыкуламі 79, 80 і 81, ажыццявіў свае права выбіраць. Гэта ён можа зрабіць толькі там, дзе будзе знаходзіцца у дзень выбараў. Ніякага завочнага галасавання быць не можа.

ПЫТАННЕ 2. Якая розніца паміж грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных?

АДКАЗ. Таварыствы працоўных, па сутнасці, з'яўляюцца відам грамадскіх арганізацый, пагэтаму асабліва рэзкай грані паміж тымі і другімі правесці нельга. Па агульнаму правілу, таварыства працоўных адрозніваецца больш лакальным характарам і больш вузкім кругам дзейнасці, канцэнтроўваючы сваю работу на адным з участкаў культурнага, тэхнічнага, спартыўнага і іншага падобнага будаўніцтва, напрыклад, таварыства вынаходнікаў, таварыства тэатральнае і т. д.

Як грамадскія арганізацыі, так і таварыствы працоўных у нашай краіне аб'яднаны адной мэтай — весці сваю дзейнасць у інтарэсах умацавання і яшчэ большага росквіту справы сацыялізма, у інтарэсах усяго перадавога, прагрэсіўнага чалавецтва.

ПЫТАННЕ 3. Колькі разоў будзе галасаваць выбаршчык у аўтаномнай рэспубліцы (аўтаномнай вобласці, нацыянальнай акрузе)?

АДКАЗ. Па-першае, кожны выбаршчык у аўтаномнай рэспубліцы (аўтаномнай вобласці, нацыянальнай акрузе) будзе галасаваць, як і кожны грамадзянін СССР, за кандыдата ў Совет Саюза.

Па-другое, ён будзе галасаваць, як і кожны грамадзянін СССР, за аднаго з 25 кандыдатаў у Совет Нацыянальнасцей ад саюзнай рэспублікі, у якой ён пражывае (РСФСР, УССР, БССР і т. д.).

Па-трэцяе, ён будзе галасаваць у Совет Нацыянальнасцей другім бюлетэнем, але ўжо за аднаго з кандыдатаў ад данай аўтаномнай рэспублікі (аўтаномнай вобласці, нацыянальнай акругі).

ПЫТАННЕ 4. Ці абавязкова пры выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбіраць дэпутатаў асоб той нацыянальнасці, якая з'яўляецца асноўнай у данай рэспубліцы (аўтаномнай вобласці, нацыянальнай акрузе)?

АДКАЗ. Не. Гэта было-б праяўленнем варожай нашай краіне нацыянальнай абмежаванасці, праяўленнем нацыяналізма.

Выбаршчыкі любой выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выберуць сваім дэпутатам таго, хто, па іх думцы, будзе правільна выражаць у Вярхоўным Совеце дзяржаўна-нацыянальныя інтарэсы данай рэспублікі (саюзнай або аўтаномнай), данай аўтаномнай вобласці, данай нацыянальнай акругі. Раз гэты чалавек глыбока пранікнут ленінска-сталінскім разуменнем нацыянальнага пытання і праявіў сябе паслядоўным, непахісным барацьбітом за ўмацаванне вялікай, непарушальнай дружбы народаў СССР, даказаў не толькі словам, але і канкрэтнымі справамі сваю адданасць сацыялістычнаму ладу, то незалежна ад сваёй нацыянальнасці ён можа быць дастойным прадстаўніком паслаўшай яго выбарчай акругі данай саюзнай (аўтаномнай) рэспублікі, аўтаномнай вобласці, нацыянальнай акругі.

ПЫТАННЕ 5. Ці можна выстаўляць кандыдатамі тых, хто пражывае не ў дакым выбарчым участку і акрузе?

АДКАЗ. Можна. «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» (артыкул 2) не ведае якога-небудзь цэнза аседласці, як і ўсякага іншага цэнза для наяўнасці права выбіраць і быць абраным, у прыватнасці не патрабуе пражывання вылучаемага кандыдата ў дэпутаты на тэрыторыі іменна данай выбарчай акругі. Пагэтаму грамадскія арганізацыі і таварыствы працоўных (артыкул 56 і 57 «Палажэння») у Данбасе, па Урале і наогул у любым раёне СССР могуць высоўваць сваімі кандыдатамі грамадзян, карыстаючыхся выбарчым правам, пражываючых у Маскве, Ленінградзе і ў іншых гарадах і раёнах СССР. Патрабуюцца толькі анкетныя даныя аб кандыдаце (прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, месца жыхарства, партыйнасць, заняткі) і заява кандыдата у дэпутаты аб яго згодзе балаціравацца па данай выбарчай акрузе. Апошняе неабходна таму, што «кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР можа галасавацца толькі ў адной акрузе» (артыкул 62 Палажэння аб выбарах).

ПЫТАННЕ 6. Як могуць удзельнічаць у выстаўленні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР сяляне аднаасобнікі?

АДКАЗ. У палажэнні аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, у раздзеле 6—парадак выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, — у артыкуле 56 гаворыцца:

«Права выстаўлення кандыдатаў у Вярхоўны Совет СССР забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных—на падставе артыкула 141 Канстытуцыі СССР: за камуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізаванымі моладзі, культурнымі таварыствамі і іншымі арганізацыямі, зарэгістраванымі ва устаноўленым законам парадку».

Сяляне аднаасобнікі не могуць выстаўляць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета на якіх-небудзь асобных сходах або на сходах калгаснікаў. Але маюць шырокую магчымасць удзельнічаць у высоўванні кандыдатаў праз тыя грамадскія арганізацыі і таварыствы працоўных, членамі якіх яны з'яўляюцца: кааператыўныя арганізацыі, Асоавіяхім, МОПР і інш.

(Матэрыял для адказаў на пытанні ўзяты з некалькіх нумароў — «Спутник агитатора»).

Адк. рэдактар ОДЗІНЕЦ С. А.

Менск, друкарня «Звязды» Тыраж 1.000 экз. Горліт № 1957